# АДНАЎЛЕННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**А. У. Кімбар**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г.Мінск;*
*kimbar@bsu.by;*
*навук. кір.: А. Г. Каханоўскі, д-р гіст. навук, праф.*

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца аналіз працэсу аднаўлення прафсаюзных арганізацый на тэрыторыі рэспублікі пасля Вялікай Айчыннай вайны. У рабоце паказаная дынаміка колькаснага росту членаў прафсаюзаў, рэарганізацыя сістэмы прафсаюзнага кіравання. Вывучэнне дадзенай тэмы спрыяе сістэматызацыі вывучэння дзейнасці прафсаюзных арганізацый у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

***Ключавыя словы***: прафесійныя саюзы; Усесаюзны цэнтральны савет прафесійных саюзаў; Упаўнаважаны УЦСПС; фабрычна-завадскія мясцовыя камітэты; Белсаўпраф.

Восенню 1943 г., з моманту пачатка вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пачалі аднаўленне сваёй дзейнасці прафсаюзныя арганізацыі Беларускай ССР.

У Гомелі было створана сем рэспубліканскіх камітэтаў і аргбюро прафсаюзаў (мяса-малочнай прамысловасці, работнікаў медыка-санітарнай працы, фінансава-банкаўскіх работнікаў, установ палітычнай асветы і інш.) [1, арк. 1]. Астатнія прафарганізацыі рэспублікі ствараліся ў 1944 і часткова 1945 гадах.

У канцы 1944 года былі прыняты рашэнні ЦК КП(б)Б і Сакратарыята Усесаюзнага цэнтральнага савета прафесійных саюзаў (далей УЦСПС) аб аднаўленні прафарганізацый ў рэспубліцы. Кіруючыся гэтымі рашэннямі, 1945–1946 гг. правялі арганізацыю рэспубліканскіх камітэтаў і аднаўленне прафарганізацый на прадпрыемствах і ва ўстановах рэспублікі.

Фактычна дзейнасць прафсаюзных органаў на тэрыторыі рэспублікі накіроўваў упаўнаважаны УЦСПС па БССР. Са снежня 1945 г., у адпаведнасці з пастановамі ЦК КП(б)Б і Сакратарыята УЦСПС, на гэтую пасаду быў прызначаны Іосіф Бельскі, які быў вядомым арганізатарам і кіраўніком партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай і Палескай абласцей. Таксама быў зацверджаны штат упаўнаважанага ў колькасці 22 адзінак [2, арк. 9].

Аднаўленне прафарганізацый праходзіла ў цяжкіх умовах. Склад прафсаюзных кадраў у Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны значна змяніўся. Многія кіруючыя прафсаюзныя работнікі загінулі ў шэрагах Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадах. Не хапала адпаведных

кіруючых кадраў, адсутнічала матэрыяльная база (памяшканні для працы, абсталяванне, грашовыя сродкі і г.д.).

На 1 студзеня 1945 г. ахоп рабочых прафсаюзным членствам складаў 66,1 % [1, арк. 18]. Упаўнаважаным УЦСПС была засяроджана галоўная ўвага на павышэнні ахопу членствам у прафсаюзах.

Пытанне прафсаюзнага членства неаднаразова ставілася на нарадах старшыняў рэспубліканскіх камітэтаў, якія склікаліся пры Упаўнаважаным. З кіруючымі работнікамі рэспубліканскіх камітэтаў, асабліва з тымі, хто адставаў у ахопе членствам, Упаўнаважаны праводзіў спецыяльныя гутаркі і асабіста даваліся ўказанні па павышэнні ахопу. Да асобных рэспубліканскіх камітэтаў прымацоўваліся ў дапамогу інструктары Упаўнаважанага УЦСПС.

Недастатковая колькасць членаў прафсаюзаў стала прадметам сістэматычнага абмеркавання на пасяджэннях прэзідыумаў усіх рэспубліканскіх камітэтаў, на ёй была завострана ўвага ўсіх пленумаў і канферэнцый рэспубліканскіх камітэтаў.

У мэтах узняцця прафсаюзнай работы і павышэння ахопу прафсаюзным членствам у студзені 1946 года Упаўнаважаным УЦСПС было ўнесена пытанне да ЦК КП(б)Б аб стане прафработы ў рэспубліцы. ЦК КП(б)Б вынес рашэнне, якім абавязаў партыйныя арганізацыі заняцца ўмацаваннем прафсаюзных арганізацый і паляпшэннем прафсаюзнай працы. У Маладзечне, Гродне, Пінску і іншых абласных гарадах былі ўпершыню праведзены прафактывы [1, арк. 9].

Дадзеныя захады мелі свой плён. За першае паўгоддзе 1946 г. працэнт ахопу прафсаюзным членствам падняўся на 12 %. У рэспубліцы было адноўлена 34 сярэднія прафесійныя звёны, з іх адзін цэнтральны камітэт работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, 28 рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў, 3 прафсаюзы работнікаў чыгуначнага транспарту, 2 басейнавыя камітэты рабочых рачнога транспарту, якія аб'ядноўваюць 7881 нізавую прафесійную арганізацыю, з колькасцю працуючых 428033 чалавек, у тым ліку членаў прафсаюзаў 319338 чалавек або 74,7 %.

З 28 рэспубліканскіх камітэтаў у 4-х з іх працавалі аргбюро, а менавіта: рабочых саўгасаў цэнтра, работнікаў МТС і земорганаў, мукамольнай прамысловасці і элеватараў, работнікаў медыка-санітарнай працы [2, арк. 18].

Аднак і пры такіх паказчыках для кіраўніцтва УЦСПС ахоп прафсаюзным членствам у рэспубліцы знаходзіўся ў нездавальняючым стане. Асабліва марудна ішоў працэс ахопу членствам у наступных прафсаюзах: рабочых і служачых шасэйнага і гідратэхнічнага будаўніцтва, авіяработнікаў, дзяржустаноў, мясцовай прамысловасці,

аўтатранспарту, лясоў і сплаву, МТС і зямельных органаў, тарфяной прамысловасці, у якіх ахоп прафсаюзным членствам дасягаў 60–66 % [1, арк. 19]. У тарфяной прамысловасці – 43 %, ва ўстановах палітычнай асветы – 51 %, у пачатковых і сярэдніх школах – 54,6 %, у рабочых МТС – 60 %, у медыка-санітарных установах – 62 %, фінбанкаўскіх работнікаў – 61 % [2, арк. 147]. Кіраўніцтва прафсаюзаў абвінавачвала ў такім становішчы прафгрупаргаў і фабрычна-завадскія мясцовыя камітэты.

Пры праверках на месцах было ўстаноўлена, што асобныя ФЗМК зусім слаба вядуць работу па ўключэнню ў саюз, пададзеныя рабочымі і службоўцамі заявы аб прыёме ў саюз месяцамі не разглядаліся, а прынятым у саюз з вялікім спазненнем афармлялі прафсаюзныя членскія білеты.

Трэба адзначыць, што некаторыя кіраўнікі ўстаноў, не кажучы пра простых рабочых, у першыя пасляваенныя гады грэбліва ставіліся да прафсаюзных арганізацый. Так, у адной са справаздач Упаўнаважанаму УЦСПС прыводзіліся наступныя факты: т. Палякоў – кіраўнік Прамбанка, член партыі – заявіў: «Што вы мяне з’агітуеце ў члены прафсаюза, захачу буду членам прафсаюза, хачу – не». Ці т. Махонін – намеснік наркама аўтатранспарту адказваў: «Я яшчэ не зразумеў густу ў прафсаюзах, калі вы мяне выхаваеце, тады ўступлю ў члены прафсаюза» [2, арк. 147].

У снежні 1946 г. брыгадай УЦСПС была праведзена праверка работы галіновых рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў і апарата Упаўнаважанага УЦСПС па Беларусі. Па выніках гэтай праверкі дзейнасць І. Бельскага была раскрытыкавана па шэрагу пунктаў: адзначалася, што работа па ўключэнні рабочых у члены прафсаюза многімі прафсаюзнымі органамі праводзілася зусім нездавальняюча. Апроч таго, шэраг рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў парушаў прафсаюзную дэмакратыю, вельмі слаба кіравалі падрыхтоўкай і правядзеннем справаздачна-выбарных прафсаюзных сходаў на прадпрыемствах і ва ўстановах. Зусім нездавальняюча прафсаюзныя арганізацыі рэспублікі ажыццяўлялі сваю арганізуючую ролю ў справе разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва рабочых і служачых за выкананне чацвёртага пяцігадовага плана [3, арк. 1]. Падкрэслівалася, што прафсаюзныя органы, у першую чаргу рэспубліканскія камітэты, самаўхіляліся ад пытанняў заработнай платы, не кантралявалі правільнасць аплаты працы і здзяйсняемых утрыманняў. Прафарганізацыі не кантралявалі пытанне жыллёвага будаўніцтва для рабочых і служачых [3, арк. 2].

Выконваючы рашэнні брыгады УЦСПС, кіраўнікі рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў і дзеячы апарата Упаўнаважанага УЦСПС па БССР узмоцнілі арганізацыйную работу. Ствараліся новыя нізавыя арганізацыі, праводзілася рэарганізацыя існуючай сеткі прафсаюзаў.

Паводле дадзеных статыстычнай справаздачы за другі квартал 1947 г., усяго па рэспубліцы колькасць рабочых налічвала 618177 чалавек, з іх членаў прафсаюза 511193 чалавек, або 82,6 %. Рэспубліканскі камітэт мясцовай прамысловасці павысіў колькасць членаў саюза на 4 %, аўтатранспарту – на 5 %, ЦК настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ – на 7 %. У той жа час у шэрагу камітэтаў назіралася зніжэнне колькасці членаў прафсаюзаў. Так, прафсаюз нафтавай прамысловасці знізіў колькасць сваіх членаў на 6,8 %, хлебапякарнай прамысловасці і работнікаў мастацтваў – на 3 %, мінскі раённы камітэт прафесійнага саюза чыгуначнікаў – на 5 % [4, арк. 1].

У жніўні 1948 г. было прынята рашэнне ЦК УКП(б) аб стварэнні саветаў прафсаюзаў у рэспубліках, краях, абласцях [5, с. 329]. У адпаведнасці з пастановамі ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б, з верасня 1948 г. пачаўся працэс стварэння рэспубліканскага і абласных саветаў прафсаюзаў. У лістападзе пачаў сваю работу Беларускі рэспубліканскі савет прафсаюзаў (Белсаўпраф), які ўзначаліў І. Бельскі. У мэтах паляпшэння кіраўніцтва нізавымі прафсаюзнымі арганізацыямі было дазволена Цэнтральнаму камітэту прафсаюза арганізаваць Бабруйскі, Брэсцкі, Віцебскі, Гомельскі, Гродзенскі, Мінскі, Магілёўскі, Маладзечанскі, Палескі, Полацкі і Пінскі абласныя камітэты прафсаюза [6, арк. 160]. Гэта паклала пачатак новаму этапу развіцця беларускіх прафсаюзаў.

Такім чынам, пачынаючы з 1943 г., пачаўся працэс аднаўлення прафсаюзных арганізацый рэспублікі. Кіраўніцтва прафсаюзаў сутыкнулася з шэрагам фактараў, якія замінілі працэсу развіцця арганізацый, што было выклікана разбуральнымі наступствамі Вялікай Айчыннай вайны. К канцу 1947 г. прафсаюзныя арганізацыі ахапілі членствам 82,6 % рабочых краіны. У 1948 г. быў ліквідаваны інстытут Упаўнаважаных УЦСПС і створаны Белсаўпраф, што спрыяла далейшаму развіццю прафесійных саюзаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Отчет о работе Уполномоченного ВЦСПС по Белоруссии за первое полугодие 1946 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 265. Воп. 5. Спр. 3.
2. Докладные записки уполномоченного ВЦСПС по БССР, стенограмма профсоюзного актива г. Минска, переписка в ВЦСПС, ЦК КПБ, Советом

Министров БССР о создании профсоюзных организаций // НАРБ. Ф. 265. Воп. 6. Спр. 2.
3. Стенограмма собрания профсоюзного актива по результатам проверки бригадой ВЦСПС работы отраслевых республиканских комитетов профсоюзов и аппарата Уполномоченного ВЦСПС по Белоруссии от 6 декабря 1946 г. // НАРБ. Ф. 265п. Воп. 5. Спр. 6.
4. Докладные записки и информации инструктора Уполномоченного ВЦСПС по Белоруссии о состоянии профсоюзной работы в профорганизациях БССР // НАРБ. Ф. 265п. Воп. 5. Спр. 17.
5. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969) / Л. П. Липинский, В. Г. Гневко, Н. Е. Завалеев [и др.]. Мн., 1970.
6. Информации, докладные записки о работе Уполномоченного ВЦСПС по БССР, переписка с ЦК КПБ и ВЦСПС о работе профсоюзных организаций республики // НАРБ. Ф. 265п. Воп. 6. Спр. 7.